УДК 821.161.3

# ЧАСОПІС “ЛУЧЫНКА” Ў НАЦЫЯНАЛЬНЫМ НАРАТЫВЕ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРУТУРЫ ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ[1]

**В.Р. Слівец**
Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П.Шамякіна, г.Мазыр, Беларусь

# MAGAZINE “LUCHYNKA” IN THE NATIONAL NARRATIVE OF BELARUSIAN LITERATURE AT THE BEGINNING OF THE 20ST CENTERY

**V.R. Slivets**
Mozyr State Pedagogical University named after I.P. Shamyakin, Mazyr, Belarus

***Анатацыя.*** У артыкуле ў гісторыка-культурным і сацыяльным кантэкстах часу разглядаецца тэматычная разнастайнасць і ідэйная скіраванасць літаратурна-навуковага часопіса для дзяцей і юнацтва “Лучынка” як часткі нацыянальнага наратыву беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя.
***Ключавыя словы:*** нацыянальная самасвядомасць, наратыў, перыядычнае выданне, гістарычны і сацыяльны кантэкст.

***Annotation.*** The article examines the thematic diversity and ideological orientation of the literary and scientific magazine for children and youth “Luchynka” as part of the national narrative of Belarusian literature at the beginning of the 20th century in the historical, cultural and social contexts of the time.
***Keywords:*** national identity, narrative, periodicals, historical and social context.

Узнікненне перыядычных выданняў, разлічаных на дзіцячую аўдыторыю, стала заканамерным вынікам легалізацыі і развіцця ў пачатку XX ст. беларускага друку ўвогуле і выхадам такіх газет, як “Наша доля” (1906) і “Наша ніва” (1906–1915), што, у сваю чаргу, было абумоўлена росквітам і папулярызацыяй ідэй нацыянальна-культуранага адраджэння.

Натуральным стаў уздым зацікаўленасці да вывучэння і распаўсюджвання ў шырокім народным асяроддзі роднай мовы, фарміравання ў грамадстве паважлівага стаўлення да яе як неад’емнай часткі ўсёй нацыянальнай культуры. З гэтай задачай, а таксама з праблемай недахопу мастацкіх твораў на беларускай мове павінны былі справіцца перыядычныя выданні для дзяцей і юнацтва, на старонках якіх мелі магчымасць друкавацца вядомыя мастакі слова. Першым такім выданнем стаў часопіс “Лучынка” – літаратурна-навуковы месячнік беларускай моладзі, заснаваны А. Уласавым у 1914 г. Літаратурным рэдактарам часопіса стала Цётка (А. Пашкевіч), якая ажыццяўляла працу па адборы і падрыхтоўцы матэрыялаў да друку, узяўшы на сябе абавязак быць *“старожкаю запаленай «Лучынкі»”* [1, с. 216].

Першы нумар часопіса адкрываўся аднайменным вершам, у якім Цётка адзначыла асветніцка-выхаваўчае прызначэнне штомесячніка, звяртаючыся да маладога пакалення з палымяным заклікам: *“Моладзь, вы сіла у кожнае хаце, – / Вы сонейка, радасць да бацькі, для маці. // Вучыцесь, старайцесь, багацесь у сілы, / Бо жджэ вас з надзеяй край наш радзімы”* [2, кн. 1, с. 1]. У другім нумары ёю канкрэтна была сфармулявана і асноўная мэта выдання, акрэслена яго чытацкая аўдыторыя: *“Лучынка будзе старацца заглянуць у кожны куток нашай Беларускай Старонкі, пазнаць усе яе балючкі, паказаць іх Табе, Моладзь, растлумачыць, якім спосабам з гэтых балючак вылячыць Родную Старонку”* [2, кн. 2, с. 2].

Выхаванне грамадзянскай і нацыянальнай свядомасці дзяцей і юнацтва стала агульным клопатам цэлага згуртавання таленавітых пісьменнікаў-адраджэнцаў: Якуба Коласа, Янкі Купалы, Змітрака Бядулі, Ядвігіна Ш., Янкі Журбы, Цішкі Гартнага, Вацлава Ластоўскага, Канстанцыі Буйло, Альберта Паўловіча, Алеся Гурло і інш. Пастаўленая рэдакцыйнай

[1] Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь па дагаворы № 1410/2021 ад 22.03.2021.

калегіяй глабальная задача фарміравання светапогляду цэлага пакалення патрабавала агульных намаганняў і шматпланавага падыходу да яе вырашэння, што абумовіла жанравую і тэматычную разнастайнасць матэрыялаў, якія друкаваліся на старонках "Лучынкі", выверанасць і лагічнасць іх падачы і кампаноўкі.

Традыцыйна аўтараў турбавалі цяжкае становішча сялян, безабароннасць дзяцей, сіроцтва, пытанні чалавечай маралі ("Міхаська", "Сірацінка" Цёткі, "Смерць пастушка", "Умарыўся" З. Бядулі, "Трэба жыць" Ц. Гартнага, "Да дзіцяці" А. Гурло, "Смерць старца" У. Галубка і інш.). Актуальныя праблемы сучаснасці ўздымала ў сваіх артыкулах Цётка ("Да вясковай моладзі беларускай", "Шануйце роднае слова!", "Аб душы маладзёжы", "Да дзяўчатак", "Да школьнай моладзі"), непакоячыся аб маладым пакаленні, на якое ўскладзена вялікая адказнасць за будучыню грамадства, сваёй краіны: *"Будучына дзержыцца на вас, моладзі, – будучых грамадзянах сваёй старонкі"* [2, кн. 4, с. 3]. Выйсце з цяжкага сацыяльнага становішча бачылася ў асвеце, пераадоленні непісьменнасці і неадукаванасці, адказным стаўленні да сваёй працы, выхаванні дзейсных, актыўных асоб з трывалай грамадзянскай пазіцыяй, што грунтуецца на гуманістычным светапоглядзе: *"Вучыся, дзіцятка, вучыцца патрэба. // Шукай сонка, праўды, хай розум не спіць. // Бо, што ты пазнаеш, ў вадзе не затоне, / Віхор не развее, ў агні не згарыць"* [2, кн. 1, с. 3]. *"Дык смела да працы! Не марнуй сваіх сіл маладых! У помачы другім, у шчасці другіх – знойдзеш шчасце сваё..."* [2, кн. 4, с. 25]. Падобныя звароты гучаць і ў іншых творах выдання ("Сірацінка" Цёткі, "Моладзі" Я. Купалы, "На ўсходзі сонца" Я. Журбы", "Сявец" Ц. Гартнага, "Кветка папараці" К. Буйло і інш.).

Падмуркам для стварэння будучыні, адзначанай нацыянальна-культурным росквітам, павінны былі стаць лепшыя набыткі мінулага, усведамленне сваёй самабытнасці. Таму важнае ідэйнае значэнне на старонках "Лучынкі" набывалі творы гісторыка-культурнай тэматыкі: "Сляды старыны" У. Галубка, "Якога мы роду-племені", "Стары шлях" В. Ластоўскага. Падарожныя нататкі Цёткі "З дарогі", "Успаміны з паездкі ў Фінляндыю", ствараючы, з аднаго боку, міжкультурны кантэкст існавання беларускай нацыі, даводзяць думку аб тым, што *"нідзе так ні пекна, як у нас"* [2, кн. 1, с. 12]. Як адзначыла А. Сабуць, у апублікаваных у часопісе артыкулах адна толькі Цётка здолела выявіць сябе ў шэрагу розных іпастасей: натураліста, батаніка, медыка, філолага, культуролага, гуманіста і гаспадыні. "Таму «Лучынку» ў поўным сэнсе можна назваць і дзіцячай энцыклапедыяй, каштоўнай першай спробай у нацыянальнай літаратуры спалучыць педагагічны, маральна-этычны і эстэтычны народны вопыт" [3, с. 16]. Акрамя твораў на гістарычную тэматыку, фарміраванню шырокага кругагляду і аб'ектыўнага ўспрымання рэчаіснасці ў маладых беларусаў спрыялі шматлікія артыкулы навукова-папулярнага характару: у галіне прыродазнаўства і геаграфіі ("Гутаркі аб птушках", "Пералётныя птушкі", "Газа", "Радый" Цёткі, "Вулкан", "Вадаспады" А. Паўловіча і інш.), эканомікі ("Даўнейшая натуральная гаспадарка і цяперашняе царства рубля", "Капітал", "Як цана робіцца і што яна значэ" А. Жывіцы) і інш.

Часопіс прадугледжваў наладжванне адваротнай сувязі са сваімі чытачамі, якія ахвотна ўключаліся ў гэты дыялог, што сведчыць аб надзённасці і запатрабаванасці выдання.

Такім чынам, нягледзячы на тое, што свет пабачылі толькі шэсць нумароў часопіса (Першая сусветная вайна парушыла ўсе планы), "Лучынка" стала неад'емнай часткай наратыву беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя, стаўшы трывалым падмуркам для развіцця асветніцка-культурных літаратурных традыцый, прасякнутых ідэяй захавання і развіцця нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

**Спіс цытуемых крыніц**

1. Цётка. Выбраныя творы / Цётка; [уклад. і прадм. В. Коўтун; камент. С. Александровіча, В. Коўтун]. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2001. – 333 с.

2. Лучынка : літаратурна-навуковы месячнік беларускай моладзі / рэд.-выдавец А. Уласаў ; літ. рэд. Цётка. – Мінск : Электрадрукарня Н. Нахумава, 1914. – Кн. 1–6.

3. Сабуць, А. "Лучынка" Алаізы Пашкевіч злучыла эпохі : да 100-годдзя выдання / А. Сабуць // Роднае слова. – 2014. – № 4. – С. 13–17.